15 сакавіка 2017 г., Менск, сталіца Рэспублікі Беларусь

**Беларуская партыя Свабода – Самаабарона**

**ЗВАРОТ**

Мы, беларускія патрыёты Свабода-Самаабарона, у сувязі з крызіснай сітуацыяй у краіне і пагрозай дэстабілізацыі, зьвяртаемся да народу, уладаў і арганізатараў пратэстаў.

Беларусь — пад прыцэлам расейскага імперыялізму і магчымага сцэнару анэксіі.

Паступілі зьвесткі аб інфармацыйнай ізаляцыі кіраўніка Беларусі А. Лукашэнкі з боку нелаяльных сілавых структур, якія выконваюць загады Крамля.

Зь іншага боку, безадказныя папулісты «Хартыі» ды іх саюзьнікі заклікаюць да рэвалюцыі, падтрымліваюць эскалацыю сітуацыі. Відавочна зацікаўленасьць Масквы ў далейшай дэстабілізацыі і ў хаосе для таго, каб узяць на сябе ролю «міратворцаў».

У гэтай абстаноўцы мы папярэджваем аб персанальнай адказнасьці прадстаўнікоў улады і апазіцыі, дзеяньні якіх могуць прывесьці да кровапраліцьця з-за патураньня планам Крамля.

Мы заклікаем да адмовы ад агрэсіўных сілавых дзеяньняў і да неадкладнай падрыхтоўкі да палітычнага дыялогу і будучых дэмакратычных выбараў.

Свабода-Самаабарона патрабуе ад улады гарантаваць незалежнасьць краіны, нейтралізаваць прарасейскіх баевікоў і абараніць беларусаў ад магчымай інвазіі звонку.

Мы зьвяртаемся да ўсіх патрыётаў краіны аб’ядноўвацца ў Нацыянальны Рух за Незалежнасьць. Свабода-Самаабарона бярэ адказнасьць за арганізацыю грамадскіх сіл і заклікае да супрацоўніцтва прадстаўнікоў дзяржаўных структур, якія разумеюць крытычнасьць моманту.

Мы спадзяемся на стратэгічную падтрымку саюзных народаў Літвы і Украіны. Мы ўпэўнены, што трэба вярнуцца да ўзаемадзеяньня па балта-чарнаморскай восі, якое сябе гістарычна апраўдала.

Але найважнейшы абавязак ляжыць на нас саміх — на яднаньні патрыётаў Беларусі вакол нацыянальнай ідэі. Давайце самі абаронім сваю Дзяржаву і падрыхтуем ўмовы для дэмакратычных рэформаў!

***Сяргей Высоцкі***, старшыня БПС-Самаабарона